КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Май-чэрвень 2017

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

МАЙ ЧЭРВЕНЬ

Віцебск 2017

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

20 красавіка ў тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Доктар філасофіі» паводле камедыі класіка сербскай драматургіі Браніслава Нушыча. Пераклад Пятра Ламана. Рэжысёр-пастаноўшчык Міхась Краснабаеў. Сцэнаграфія і касцюмы Святланы Макаранкі. Музычнае афармленне Аляксандра Крыштафовіча. Пластыка Дзіяны Юрчанкі. У ролях: Юрась Цвірка, Рыгор Шацько, Таццяна Ліхачова, Арцём Герак, Дзмітрый Каваленка і інш.

У канцы красавіка дзіцячая вакальна-эстрадная студыя «Славія» Пастаўскага Цэнтра культуры і народнай творчасці (кіраўнік – А. А. Нікалаева) прыняла ўдзел у міжнародным вакальным конкурсе «Спускаючыся на крылах песні» ў літоўскім горадзе Рокішкіс. У сярэдняй узроставай групе гурт «Фантазія» заваяваў дыплом другой ступені. У намінацыі «Салісты» дыпломам трэцяй ступені ўзнагароджана Дар'я Гагалінская. (*Пастаўскі край. – 2017. – 17 мая. – С. 6.*)

28 красавіка на Міёршчыне адбылося раённае свята фальклору «Нам засталася спадчына». Мерапрыемства праходзіла ў Цвецінскім і Язненскім Дамах культуры. Асноўная нагода – 30-годдзе народнага фальклорнага гурта «Язынка». (*Міёрскія навіны. – 2017. – 16 мая. – С. 7.*)

ХАРЭАГРАФІЯ

Каля 100 прафесійных бальных пар сабраў рэспубліканскі конкурс ансамбляў спартыўнага бальнага танца «Майскі баль» на сцэне Канцэртнай залы «Віцебск» **20–21 мая**. Арганізатары – Цэнтр культуры «Віцебск», ансамбль спартыўнага бальнага танца «Фэст», Віцебская абласная федэрацыя спартыўнага танца. У конкурсе спаборнічалі калектывы з розных гарадоў Беларусі і Расіі. Гран-пры ў катэгорыі «Дзеці» прысуджаны віцебскаму ансамблю «Фэст», у катэгорыі «Юніёры» – ансамблю «ОниОна» з Гродна. У катэгорыі «Моладзь» Гран-пры падзялілі ансамбль «Фэст» і ансамбль «Элегія» са Жлобіна. Спецыяльным прызам журы за папулярызацыю музыкі беларускіх кампазітараў быў адзначаны ансамбль «Стиль» са Смаленска.

Удзельніц ва ўзросце ад 6 да 65 гадоў з сямі гарадоў Беларусі і Расіі сабраў адкрыты гарадскі конкурс аматараў усходняга танца «Золотая мониста-2017», які прайшоў на сцэне Цэнтра культуры Наваполацка ў 11-ы раз.

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Май-чэрвень

2017

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2017

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *К. Д. Яскевіч*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : май–чэрвень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2017. – 42 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017

«Лялька» ўдзельнічалі ў адкрыцці скульптур Хатабыча і Рыбкі. Таксама ў тэатры адбылася сустрэча з майстрамі-артыстамі народнасці ханты. Госці з расійскага горада-пабраціма Белаярскага наладзілі для супрацоўнікаў тэатра спектакль з народнай музыкай, спевамі, танцамі.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

5 мая ў Віцебскім музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага адбыўся фінал абласнога конкурсу навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў па класе баяна-акардэона. Першае месца ў малодшай узроставай групе прысуджана Аляксандру Іжмайловічу з Пастаўскай ДШМ імя А. Тызенгаўза, у старэйшай групе – Даніілу Асяпёнку з Полацкай ДШМ.

Вакалістка эстраднай студыі «8-я нота» Цэнтра культуры Наваполацка Ксенія Вашчанка стала лаўрэатам І ступені Міжнароднага конкурсу «Кубок Европы» ў г. Мінску (намінацыя «Джазавы вакал-сола»).

У восьмы раз у ДШМ № 3 г. Барані прайшоў дзіцячы форум-фестываль фартэпіяннай музыкі «Музыкальная капель», які сабраў 152 юных выканаўцаў з Віцебскай, Магілёўскай абласцей і г. Мінска.

7 чэрвеня Віцебская абласная філармонія запрасіла гледачоў на новую праграму сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам У. Бяляўскага «Летняя рапсодыя», якой закрыла XXVIII канцэртны сезон.

Удзельнікі народнай вакальнай групы «Вясна» і калектыву-спадарожніка «Фортэ» Цэнтра культуры Наваполацка ўдзельнічалі ў Міжнародным дзіцячым і юнацкім фестывалі-конкурсе музычнай творчасці ў латвійскім горадзе Рэзекне, дзе сталі лаўрэатамі І і ІІ ступені.

9 творчых калектываў з Оршы, Мінска, Віцебска, Полацка прынялі ўдзел у ІІІ адкрытым фестывалі-конкурсе дзіцячых і юнацкіх харавых калектываў «Аршанская скарбніца», які праходзіў у Аршанскай ДШМ № 1.

чытанні «Школьны тэатр-21». 13 творчых калектываў прадставілі на суд журы на чале з народнай артысткай Беларусі Святланай Акружной свае пастаноўкі. Галоўны прыз быў уручаны ўзорнай студыі «Дарослыя дзеці» гімназіі № 8 (кіраўнік Аляксандра Раманава) за аўтарскі спектакль «Пра мужыка, які на неба лазіў».

25 мая ў тэатры імя Я. Коласа адбыўся бенефіс артысткі, вядучага майстра сцэны Святланы Жукоўскай «…па сцэне босымі нагамі…», прысвечаны 55-годдзю з дня нараджэння і 35-годдзю творчай дзейнасці на роднай віцебскай сцэне. У праграму творчага вечара былі ўключаны песні і рамансы ў выкананні актрысы.

25 мая ў Беларускім тэатры «Лялька» былі падведзены вынікі гадавой працы аддзела дэкаратыўна-прыкладного мастацтва Віцебскага гарадскога Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Мастацкі кіраўнік «Лялькі» Віктар Клімчук узнагародзіў дыпломамі самых актыўных удзельнікаў сумеснага праекта «Творца жыве ў кожным з нас». У праграме: майстар-класы, баль з удзелам гурта «Паўночная вежа», гульні, паказ спектакля «Прынцэса і Свінапас» паводле казкі Г Х. Андэрсэна.

27 і 28 мая ў тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм’ера спектакля «Глыток чужога віскі» па п’есе сучаснага ізраільскага драматурга Лявона Агулянскага. Пераклад на беларускую мову Алеся Замкоўскага. Рэжысёр-пастаноўшчык Валерый Анісенка. Сцэнаграфія Андрэя Жыгура. Музычнае афармленне Аляксандра Крыштафовіча. Пластыка Дзіяны Юрчанкі. У ролях: Наталля Аладка, Генадзь Гайдук, Георгій Лойка, Ніна Обухава, Юрась Цвірка і інш.

Артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа прынялі ўдзел у IV Міжнародным тэатральным фестывалі «У Троицы» (г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобласці). **22 чэрвеня** быў паказаны знакаміты спектакль «Шагал… Шагал…» па п’есе Уладзіміра Драздова (рэжысёр Віталь Баркоўскі).

На святкаванні Дня горада Віцебска артысты Беларускага тэатра

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 мая па 30 чэрвеня 2017 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

5 мая ва Ушачах было праведзена раённае свята «Минувших лет святую память мы будем бережно хранить», прысвечанае 72-й гадавіне Вялікай Перамогі, 73-й гадавіне прарыву варожай блакады партызанамі Полацка-Лепельскай партызанскай зоны і 90-годдзю ДТСААФ. Мерапрыемствы праходзілі ў райцэнтры і на мемарыяльным комплексе «Прарыў». У праграме: мітынгі, канцэрты, паказальныя выступленні вайскоўцаў, тэматычныя пляцоўкі, рэканструкцыя бою – прарыву варожай блакады (Віцебскае абласное грамадскае аб'яднанне ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Таварышы па зброі»), адкрыццё выставы работ мастака-манументаліста Уладзіміра Крываблоцкага. Дэлегацыю вобласці ўзначаліў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў.

Традыцыйна маштабна прайшло на Віцебшчыне святкаванне **Дня Перамогі**. Былі арганізаваны мітынгі, патрыятычныя акцыі «Бессмяротны полк», «Яны змагаліся за Радзіму», маладзёжныя акцыі «Свечка памяці», «Голуб Перамогі», працавалі тэматычныя пляцоўкі, выставы і інтэрактыўныя зоны. Атмасферу свята стваралі работнікі культуры і творчыя калектывы. Праводзіліся тэатралізаваныя прадстаўленні, канцэрты, вечары франтавой песні. Ладзіліся дыскатэкі, гучалі святочныя салюты.

16 мая ў Полацку пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Васіля Жарко адбылося пасяджэнне нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства. У рабоце пасяджэння прынялі ўдзел міністр культуры Барыс Святлоў, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З 18 мая да 16 чэрвеня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці экспанавалася выстава работ майстроў народна-мастацкіх рамёстваў Смаленскай вобласці і г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці «Содружество» ў межах культурнага абмену. Смаленскія майстрыхі прадставілі жаночыя рускія народныя касцюмы з какошнікамі і стылізаваныя сукенкі, правялі майстар-клас роспісу па тканіне. Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Вялікіх Лук было прадстаўлена разнастайнымі творамі. Гэта вырабы з лазы, бяросты, скуры, разьба і роспіс па дрэве, лапікавае шыццё, лакавая мініяцюра і інш. У адкрыцці выставы прынялі ўдзел ансамбль песні «Лада» Дома культуры «Сортировка» (Смаленск) і вялікалуцкія персанажы – асілак Лука і княгіня Вольга.

20 мая ў г. Мінску адбыўся IX Рэспубліканскі фестываль-кірмаш народных мастацкіх рамёстваў «Вясновы букет». Віцебскую вобласць на свяце прадстаўлялі 25 майстроў народных мастацкіх рамёстваў з Глыбоцкага, Гарадоцкага, Талачынскага, Шаркаўшчынскага раёнаў, г. Віцебска. Гран-пры за лепшую калекцыю работ прывезлі шасцёра майстроў Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору. Народныя ўмельцы паказалі свае таленты ў мастацтве лозапляцення, ткацтва паясоў, вышыўкі, спіральнага пляцення, керамікі, правялі майстар-класы для ўсіх жадаючых. Першае месца атрымала майстар Святлана Скавырка ў намінацыі «Маляванка».

Напрыканцы чэрвеня ў Віцебскім АМЦНТ адкрылася абласная выстава-конкурс майстроў саломапляцення «Золата роднай зямлі». У экспазіцыі прадстаўлены творы майстроў раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў Віцебшчыны.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

15–16 мая ў тэатральнай гасцёўні Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа адбыўся гарадскі конкурс «Сцэнічныя

выстава «Невядомы Міхаіл Савіцкі», прымеркаваная да 95-годдзя з дня нараджэння народнага мастака СССР і Беларусі, Героя Беларусі Міхаіла Савіцкага.

9 мая ў Наваполацкім Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры адкрылася выстава работ аднаго са старэйшых мастакоў Наваполацка, члена Саюза мастакоў Беларусі Пятра Грывусевіча. У экспазіцыі «Была вайна» прадстаўлены творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне.

У філіяле Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва – Арт-прастора «Талстога, 7» адкрылася выстава мінскай фотамастачкі Юліі Мацкевіч «Беларуская Прага». У адкрыцці экспазіцыі прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі Мілан Экерт.

У Мастацкім музеі Віцебска **ў маі** адкрылася фотавыстава вядомага савецкага і літоўскага акцёра тэатра і кіно Юозаса Будрайціса. Аўтар экспазіцыі прэзентаваў музею кнігу «Мой Парыж» – аднайменную з назвай выставы. На вернісажы прысутнічаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Беларусі Андрус Пулокас.

У Мастацкай галерэі Полацка ў **маі-чэрвені** экспанавалася выстава работ вядомай беларускай мастачкі Зоі Літвінавай. У экспазіцыі «Высокі бераг» былі прадстаўлены жывапіс, графіка, габелен.

10–11 чэрвеня ў Віцебску прайшлі XXVI міжнародныя Шагалаўскія чытанні, прысвечаныя 130-годдзю з дня нараджэння знакамітага мастака. У канферэнцыі прынялі ўдзел 12 даследчыкаў з Расіі, Беларусі і ЗША. Юбілею Майстра была прысвечана і выстава фотапраекцый віцебскага краязнаўцы і аўтара гістарычных фотарэканструкцый Віктара Барысенкава пад назвай «Как давно, мой город любимый, я не видел тебя…» у Арт-цэнтры Марка Шагала.

Віцебская мастачка Вольга Іванова адкрыла выставу пад назвай «Окно и двор, и белые деревья» ў Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі. У экспазіцыі каля 30 акварэльных твораў – пейзажы, нацюрмоты, партрэты.

Уладзімір Пенін, кіруючыя асобы рэспубліканскіх ведамстваў, Віцебскага аблвыканкама і Полацкага райвыканкама. Члены аргкамітэта пазнаёміліся з падрыхтоўкай асноўных аб’ектаў, наведалі Мастацкую галерэю, комплекс будынкаў былога езуіцкага калегіума, Сафійскі сабор, Музей беларускага кнігадрукавання. (*Полацкі веснік. – 2017. – 19 мая. – С. 1–2.*)

24–25 мая ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку адбылася IV Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання», якая прайшла пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы акадэмій навук, буйных ВНУ, музеяў, архіваў, бібліятэк з Беларусі, Балгарыі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Узбекістана, Украіны, Францыі і Чэхіі. У межах мерапрыемства быў праведзены семінар «Франциск Скорина – личность, деятельность, наследие, современные образы», адбылося адкрыццё выставы «Бібліі Рускай» Францыска Скарыны – 500 гадоў».

27 мая ў аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна адбыўся выніковы форум сумеснай ініцыятывы «Адукацыя і адраджэнне гісторыка-эканамічнай спадчыны для ўстойлівага развіцця Мазалаўскага і Бабініцкага сельскіх саветаў». У ім прынялі ўдзел не толькі непасрэдныя выканаўцы праекта, але і прадстаўнікі ўстановы «Новая Еўразія», прадстаўніцтва нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў, а таксама дэлегацыя Даўгаўпілскага краю Латвійскай Рэспублікі. Да мерапрыемства са статусам раённага былі прымеркаваны «Квас-фэст», агляд-конкурс «Маладыя гаспадары-2017», краязнаўчая квэст-гульня і інш. (*Жыццё Прыдзвіння. – 2017. – 3 чэрв. – С. 5.*)

31 мая на базе Лёзненскага раёна адбылося пасяджэнне калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, на якім была разгледжана тэма рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў рэгіёнах вобласці. Удзельнікі пасяджэння пабывалі на Алеі Славы, дзе размешчаны партрэты Герояў

Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы, наведалі раённы Цэнтр культуры, культурна-аздараўленчы цэнтр.

У маі прайшло выязное пасяджэнне Віцебскага райвыканкама, на якім былі падведзены вынікі дзейнасці ўстаноў культуры раёна ў 2016 годзе. Пра рэалізацыю культурнай палітыкі на тэрыторыі раёна расказала начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Марына Здольнікава. Кіраўнік раённай вертыкалі Генадзь Сабыніч адзначыў высокі ўзровень работы культасветустаноў раёна. Начальнік аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Галіна Баркевіч адзначыла, што ў раёне рэалізуюцца многія цікавыя праекты, па паказчыках дзейнасці ў галіне культуры раён уваходзіць у дзясятку лепшых, а па асобных паказчыках – у тройку лідараў. Удзел у рабоце пасяджэння прыняла галоўны спецыяліст упраўлення устаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Алена Палавец. Старшыня абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Алена Сабірава ўручыла Марыне Здольнікавай Ганаровую грамату Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Дзень памяці святой Еўфрасінні Полацкай сабраў **5 чэрвеня** ў самым старажытным горадзе Беларусі тысячы паломнікаў з розных рэгіёнаў краіны і замежжа. У гэтым годзе праграма свята была насычана вялікай колькасцю духоўна-асветніцкіх мерапрыемстваў, якія прайшлі ва ўсіх установах асветы і культуры. У Полацкім дзяржуніверсітэце адбыўся навуковы семінар, у Сафійскім саборы – тэматычны канцэрт, у Палацы культуры ААТ «Полацк-Шкловалакно» – вечар мастацтваў «Еўфрасіння – дачка зямлі Полацкай». Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік запрасіў наведвальнікаў на прэзентацыю актавай пячаці прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

9–11 чэрвеня сваё 59-годдзе адсвяткаваў г. Наваполацк. На свята прыехалі прадстаўнікі гарадоў-пабрацімаў з Расіі, Украіны, Латвіі, Сербіі, Польшчы. Актыўны ўдзел прынялі ўстановы культуры горада. Свята кнігі

гарадской адкрытай выставе-конкурсе малюнка і дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Беларусь – Кітай-2017» было прадстаўлена звыш 280 работ юных віцяблян. Выстава арганізавана ў гонар 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітаем.

Узорны ансамбль народнага танца «Радасць» Глыбоцкай ДШМ (мастацкі кіраўнік Галіна Худзякова) прыняў удзел у 26-м Міжнародным юнацкім фестывалі музычнай творчасці «Земля – наш общий дом» у г. Екацярынбургу (Расія).

У Віцебску ў 11-ы раз пад дэвізам «Эмоцыі» праходзіла выстава-конкурс дзіцячай творчасці «Перспектыва». Гэты праект аб'ядноўвае навучэнцаў Дзіцячай мастацкай школы, школы мастацтваў № 1 і школы мастацтваў № 3 «Маладзік».

У рамках двухбаковага супрацоўніцтва паміж Шаркаўшчынскай дзіцячай школай мастацтваў, Шпогскімі музычнай і мастацкай школамі Латвійскай Рэспублікі **ў сярэдзіне чэрвеня** педагогі і вучні Шаркаўшчынскай ДШМ наведалі латвійскіх сяброў. Праходзілі сумесныя рэпетыцыі, развучваўся песенна-музычны рэпертуар дзвюх краін, вынікам чаго стаў сумесны канцэрт калектываў.

У Міжнародным фестывалі «Творчасць без межаў-2017», які праходзіў **19–26 чэрвеня** ў Італіі, удзельнічалі юныя артысты з Віцебска: узорная вакальная студыя «Ассоль» (кіраўнік Алена Фальковіч), узорны вакальна-харавы калектыў «Двина» (кіраўнік Вольга Фальковіч), узорны ансамбль танца «Егоза» (кіраўнік Людміла Самсонава), маладзёжны тэатр эстрады «Школа звезд» (кіраўнік Раман Рыкаў). З фестывалю, у якім ўдзельнічалі дзеці і моладзь з 14 краін, віцябляне вярнуліся з дыпломамі.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Віцебскі мастак **Аляксандр Салаўёў** удастоены ганаровага звання «Витебчанин года» ў намінацыі «Грамадскае прызнанне».

У Віцебскім Мастацкім музеі **на працягу мая** экспанавалася

Doll'я». Аўтары – лепшыя майстры з розных куткоў Еўропы.

Напрыканцы чэрвеня быў урачыста адкрыты Музей міфаў; ён разам з міфалагічнай экасцяжынай і сонечнай электрастанцыяй уваходзіць у Цэнтр міфалагічнага турызму, што працуе ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. Музей міфаў мае тры залы. У аснове канцэпцыі ляжыць Сусветнае дрэва. Першая зала распавядае пра традыцыйныя каляндарныя святы, абрады, вераванні. Другая – падзем'е, цемра. Трэцяя зала – неба, вырай. У кожнай зале наведвальнікаў чакаюць свае цікавыя расповеды, гукі, светлавыя эфекты. (*Краязнаўчая газета. – 2017. – № 25. – С. 1, 6.*)

МАСТАЦТВА

Дзіцячая школа мастацтваў № 1 г. Віцебска адзначыла 50-гадовы юбілей. З гэтай нагоды ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі **ў маі** праходзіла вялікая выстава творчых работ навучэнцаў і выпускнікоў мастацкага аддзялення ДШМ. У актавай зале школы мастацтваў адбыўся святочны канцэрт, на якім педагогі і вучні прадэманстравалі сваё музычнае, мастацкае і харэаграфічнае майстэрства. Дырэктару школы Людміле Шчурцовай быў уручаны нагрудны знак Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». Многія педагогі былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі.

17 мая педагогі і выхаванцы Расонскай дзіцячай школы мастацтваў пабывалі ў пасёлку Ідрыца Себежскага раёна Пскоўскай вобласці па запрашэнні калектыву Ідрыцкай музычнай школы. На сцэне мясцовага Дома культуры адбыўся вялікі канцэрт юных талентаў Расонскай ДШМ: узорнага цымбальнага аркестра, харэаграфічнай студыі «Ассоль», салістаў-вакалістаў і інш.

19 мая сваё 60-годдзе святкавала Гарадоцкая дзіцячая школа мастацтваў. За 56 выпускаў са сцен установы выйшлі 1178 выхаванцаў, 97 з якіх звязалі сваё жыццё з культурай і мастацтвам.

У дзіцячай школе мастацтваў № 3 г. Віцебска «Маладзік» на

падрыхтавалі бібліятэчныя работнікі. Працавалі тэматычныя пляцоўкі, «Горад майстроў». Канцэрт інструментальнай музыкі ў выкананні навучэнцаў ДШМ № 1 і вячэрняя дыскатэка ад кампаніі Velcom сталі дабрым падарункам для навапалачан.

23–24 чэрвеня г. Віцебск адзначыў свой 1043-і дзень нараджэння. У падарунак віцябляне атрымалі манументальна-дэкаратыўныя скульптуры «Старик Хоттабыч» і «Рыбка», доўгачаканы тралейбусны маршрут № 11, вернісажы, канцэртныя праграмы і інш. У Летнім амфітэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, ушанаванне лаўрэатаў прэміі «Витебчанин года» і канцэрт «С днем рождения, любимый город!». Упершыню ў рамках свята горада Віцебска сваю праграму прадставіла муніцыпальная аўтаномная ўстанова культуры Белаярскага раёна Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі Югра (Расія).

27 чэрвеня ў Оршы стартавалі масавыя святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 950-годдзю горада. Ля будынка райвыканкама адбылася ўрачыстая цырымонія ўзняцця сцяга горада і адкрыццё Дошкі гонару Аршанскага раёна. Да памятнага знака воінам-вызваліцелям былі ўскладзены вянкі і кветкі. На плошчы Леніна прайшоў флешмоб "Салютуем табе, наш горад!". 29–30 чэрвеня адбыліся Міжнародны фестываль цеплавых аэрастатаў «Мірнае неба Аршаншчыны» з удзелам экіпажаў Беларусі і Латвіі; «Дзень маладзёжных культур», Міжнародная канферэнцыя «Орша на мяжы тысячагоддзя» і інш.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У маі ў выставачнай зале «Духаўскі круглік» абласнога цэнтра адбылася сустрэча «Линии сотрудничества и развития: Латвия – Беларусь» з прадстаўнікамі дыпламатычнага корпусу Латвійскай Рэспублікі, прысвечаная 25-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. У гэты дзень гучала беларуская і латышская музыка ў выкананні народнага ансамбля цымбалістаў «Гарэзлівыя

перазвоны». Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў адзначыў, што многае зроблена за чвэрць стагоддзя супрацоўніцтва, у тым ліку і ў культурным развіцці. У Віцебску праходзяць Дні Латвіі, у Латвіі – Дні Рэспублікі Беларусь. Важным звяном у арганізацыі сувязяў у сферы эканомікі, турызму, культуры з'яўляецца консульства Латвіі ў Віцебску.

Яркім прыкладам культурнага абмену ў рамках 20-гадовага супрацоўніцтва паміж Оршай і Вязьмай Смаленскай вобласці стаў канцэрт народнай студыі эстрадных спеваў «Креатив» гарадскога Палаца культуры «Орша» на сцэне Палаца культуры «Центральный» г. Вязьмы. Выступленне аршанцаў – падарунак жыхарам горада-пабраціма да свята Вялікай Перамогі.

VI Міжнародны эканамічны форум «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы», які прайшоў **11–12 мая** ў Віцебску, стаў выдатнай пляцоўкай для наладжвання новых сяброўскіх сувязяў з гарадамі і рэгіёнамі суседніх краін, і ў першую чаргу Расіі. 11 мая з мэтай развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў эканамічнай, культурнай, сацыяльнай і адукацыйнай сферах быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Глыбоцкім раёнам і муніцыпальным утварэннем – гарадское пасяленне «Горад Лук'янаў» Ніжагародскай вобласці. На наступны дзень расійскія партнёры наведалі Глыбоччыну і пазнаёміліся з гісторыяй, культурным і сацыяльна-эканамічным развіццём раёна. Госці пабывалі ў раённым гісторыка-этнаграфічным музеі і музеі знакамітага авіяканструктара ў СШ № 1 імя П. В. Сухога. Кіраўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улад Сенненскага раёна падпісалі пратакол аб развіцці супрацоўніцтва з Пясчанакопскім раёнам Растоўскай вобласці і Пачынкаўскім раёнам Смаленскай вобласці. Плануецца развіццё адносін не толькі ў эканамічнай сферы, але і ў культурнай.

26–27 мая дэлегацыя Шаркаўшчынскага раёна была запрошана на святкаванне 50-годдзя латвійскага горада Айзкраўкле, размешчанага на рацэ Даўгаве. Калектывы мастацкай самадзейнасці раённага Цэнтра

краязнаўчым музеі адкрыліся фотадакументальная выстава «Мужнасць, верная доўгу», выстава ваеннай экіпіроўкі «На варце Радзімы», быў праведзены інтэрактыўны квэст-тур «У пошуку эліксіру маладосці». У музейных установах Віцебшчыны праходзіла і штогадовая акцыя «Ноч музеяў». Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей прапанаваў наведвальнікам новы праект – ток-шоу «Два мястэчкі – адна гісторыя». У праграме музейнай ночы «Начніцы-Таямніцы» ў Верхнядзвінскім гісторыка-краязнаўчым музеі: падарожжа ў славянскую міфалогію, прэзентацыя «Артэфакты мінулага», майстар-класы і прадказанні, творчая праграма народнага гурта архаічных спеваў «Княжыч» з Полацка. Наведвальнікі Лепельскага краязнаўчага музея пазнаёміліся з выставай «Вясельны перапалох, альбо Вяселле па-лепельску».

У Полацкім краязнаўчым музеі экспанавалася выстава «Хутка ў нумар», прысвечаная 100-гадоваму юбілею газеты «Полацкі веснік».

16 чэрвеня адбылося ўрачыстае адкрыццё гісторыка-краязнаўчага музея Пальмінскай СШ Гарадоцкага раёна. Тры кабінеты школы пераўтвораны ў залы комплекснага музея: баявой славы, гісторыі школы і беларускую хатку. У мерапрыемстве ўдзельнічалі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў і прадстаўнікі раённай улады.

27 чэрвеня ў Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання адкрылася выстава «Доктару Скарыну прысвячаецца». У экспазіцыі шырока прадстаўлены разнастайныя выданні скарынаўскай тэматыкі і творы мастацтва, прысвечаныя беларускаму першадрукару. У ліку аўтараў – вядомая мастачка, Ганаровы грамадзянін горада Полацка Нінель Шчасная.

У Полацкім музеі баявой славы **ў чэрвені** адкрылася выстава «Курган Бессмяротнасці: 50 гадоў ў гісторыі Полацка».

У Аршанскім музеі У. С. Караткевіча дзейнічала выстава «Орша ў архіўных дакументах», прысвечаная 950-годдзю горада.

У выставачнай зале музея гісторыі і культуры г. Наваполацка **ў чэрвені** экспанавалася ўнікальная выстава аўтарскіх лялек «Панна

аграгарадку Копці Віцебскага раёна ўнікальныя экспанаты часоў Вялікай Айчыннай вайны былі прадстаўлены ў музеі на калёсах. Побач з Расонскім музеем баявой садружнасці была арганізавана выстава асабістых рэчаў і сувеніраў легендарнага партызанскага камандзіра, былога кіраўніка рэспублікі П. М. Машэрава. Тут жа экспанаваліся работы мастака Дзмітрыя Кузякова – былога вязня фашысцкіх лагераў. Жадаючыя мелі магчымасць наведаць музей пад адкрытым небам недалёка ад вёскі Роўнае Поле, на месцы стаянкі партызанскай брыгады імя Ракасоўскага.

«Память со слезами на глазах» – пад такой назвай у Аршанскім музеі У. С. Караткевіча праведзена літаратурна-музычная гасцёўня, прысвечаная Дню Перамогі. У музеі сабраліся прадстаўнікі школьных музеяў, тэматыка якіх прысвечана героям Вялікай Айчыннай вайны і іх подзвігам. Удзельнікі мерапрыемства першымі пазнаёміліся з новай выставай «В жизни всегда есть место подвигу».

16 мая ў рамках святкавання Дня Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылося ўрачыстае адкрыццё скульптурнай кампазіцыі «Прафесар Полацкай акадэміі», якая стала яшчэ адным яркім упрыгожаннем комплекса Полацкага калегіума. Аўтар – скульптар Аляксандр Прохараў.

17 мая ва Ушачах адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар былога дырэктара Ушацкага лясгаса, заслужанага лесавода БССР Мікалая Дарафеевіча Бабаедава.

18 мая адзначаўся Міжнародны дзень музеяў. У музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка быў праведзены квэст па асноўных вехах развіцця горада «Музейные сыщики». Расонскі музей баявой садружнасці правёў мультымедыйную прэзентацыю «История музея в лицах и событиях» і патрыятычны квэст «Героические страницы родного края». У Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава міжнароднага праекта «Незнаёмка», якую прэзентавалі фітакалажысты міжнароднай творчай асацыяцыі «Флориссима». Госці з Масквы правялі майстар-класы па фларыстычным калажы. У Шумілінскім гісторыка-

культуры, Германавіцкага Цэнтра культуры і народных традыцый, майстры раённага Цэнтра рамёстваў прынялі актыўны ўдзел у «Фестывалі традыцый». У «Славянскай сядзібе» шаркаўчане разам з прадстаўнікамі Польшчы, Расіі, Украіны знаёмілі латышоў з культурнай спадчынай свайго краю. Развіццю культурных сувязяў паспрыяў падпісаны ў снежні 2016 года пратакол намераў аб супрацоўніцтве паміж Шаркаўшчынскім райвыканкамам і адміністрацыяй г. Айзкраўкле.

27 мая на Замкавай гары ў латвійскім горадзе Лудза праходзіў XX Міжнародны фестываль народнай музыкі, які сабраў лепшых музыкантаў з розных краін Еўропы. Беларусь на прыбалтыйскай зямлі прадстаўлялі ансамбль народных інструментаў «Жарт» у складзе выкладчыкаў Наваполацкай ДШМ № 1 і дуэт гарманістаў Падсвільскай дзіцячай школы мастацтваў Глыбоцкага раёна Мікалай Савуліч і Уладзімір Бурэнь. Наваполацк і Глыбоччыну звязваюць з Лудзай даўнія партнёрскія сувязі.

У канцы мая – пачатку чэрвеня дэлегацыя Шумілінскага раёна на чале са старшынёй райвыканкама Аляксандрам Снаравым наведала Лодзінскае ваяводства і гміну Макув (Польшча) з мэтай умацавання сяброўскіх стасункаў, развіцця эканамічных і культурных сувязяў. У складзе дэлегацыі была група народнага ансамбля Обальскай дзіцячай школы мастацтваў «Гарэзнікі». У рамках візіту было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж муніцыпалітэтам Макув і Шумілінскім райвыканкамам у гандлёва-эканамічнай і аграрна-прамысловай галінах, сферах турызму, адукацыі, культуры і інш.

2–3 чэрвеня Шаркаўшчынскі раён наведала дэлегацыя Зарасайскага раёна Літоўскай Рэспублікі на чале з мэрам Нікалаюсам Гусевасам. Літоўскія госці прынялі ўдзел у раённым турыстычным злёце, прысвечаным Году навукі, наведалі Лужкоўскую СШ, яе школьны музей і дэндрарый. У рамках візіту былі абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, турызму і культуры.

Дэлегацыя Сенненшчыны наведала **ў чэрвені** Пачынкаўскі раён Смаленскай вобласці з мэтай пашырэння кантактаў у сферы эканомікі,

асветы, культуры. Сенненцы прынялі ўдзел у святкаванні Дня Расіі ў Пачынку. Жыхары расійскага рэгіёна пазнаёміліся з творчасцю артыстаў народнага фальклорнага калектыву «Вясёлыя музыкі» і ВІА «Судьба».

12 чэрвеня народны ансамбль песні і танца «Яблынька» Гарадоцкага ГДК прыняў удзел у мерапрыемствах, прысвечаных 22-й Міжнароднай сустрэчы паветраплавальнікаў і святкаванню Дня Расіі ў г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. Народны фальклорны калектыў «Азерыца» Езярышчанскага ГПДК пабываў з творчым візітам у Курску, дзе выступіў у канцэртнай праграме ў рамках XVII міжрэгіянальнага ўніверсальнага кірмашу «Курская Коренская ярмарка-2017». (*Гарадоцкі веснік. – 2017. – 24 чэрв. – С. 8.*)

24 чэрвеня дэлегацыя Талачынскага раёна пабывала на святкаванні 65-годдзя горада Сафонава Смаленскай вобласці. У рамках візіту адбыліся сустрэчы з кіраўніцтвам Сафонаўскага раёна, абмен вопытам работы па розных пытаннях вытворчай, сацыяльнай і культурнай сфер з кіраўнікамі арганізацый і ўстаноў расійскага рэгіёна. На сцэне Сафонаўскага Палаца культуры выступіў народны ансамбль песні і музыкі «Александрына» Коханаўскай школы мастацтваў.

29–30 чэрвеня на IV Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў маскоўскім «Экспацэнтры» было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Віцебскім гарвыканкамам і адміністрацыяй горада Іркуцка. У рамках пагаднення бакі абавязаліся развіваць адносіны ў гандлёва-эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах.

30 чэрвеня дэлегацыя Міёршчыны прыняла ўдзел у III Міжнародным фестывалі «Рака Вялікая» ў горадзе Апочка Пскоўскай вобласці, які сабраў расіян, беларусаў і латышоў. Дэвіз фестывалю – «Без памяці – няма традыцый, без традыцый – няма культуры».

Чарговае, 36-е пасяджэнне Савета Еўрарэгіёна «Азёрны край» прайшло **ў чэрвені** ў Докшыцах. У ім прынялі ўдзел члены Савета і запрошаныя госці з Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Віцебскага, Глыбоцкага, Пастаўскага, Полацкага, Расонскага, Шаркаўшчынскага

культуры прайшла прэзентацыя кнігі мясцовага пісьменніка Мікалая Грабянька «Одум».

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

17 мая работнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі ў вёсцы Сіроціна правялі літаратурна-музычную кампазіцыю «Франтавая брыгада». Мерапрыемства праходзіла для сацыяльна-неабароненых груп насельніцтва, пажылых і інвалідаў.

20 чэрвеня ў ЦРБ прайшла творчая сустрэча з майстрам па саломапляценні Наталляй Сцержанковай «Зіхаціць золатам саломка», якую падрыхтавалі народная літаратурна-музычная гасцёўня «Крыніца» і работнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

«Они сражались за Родину» – так называецца новы праект Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова, які стартаваў напярэдадні 72-й гадавіны Вялікай Перамогі. Яго мэта – стварэнне паўнацэннай і агульнадаступнай базы даных пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны – ураджэнцаў Віцебшчыны, увекавечанне іх подзвігу.

5–6 мая на базе музея народнай славы СШ № 1 г. п. Лёзна прайшоў XVIII Міжнародны злёт музеяў Баявой Славы 158-й Лёзненска-Віцебскай двойчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава стралковай дывізіі. У рабоце злёта прынялі ўдзел дэлегацыі школы № 1101 і школы № 1329 г. Масквы, СШ № 1 г. Рудні і СШ № 1 г. Веліжа Смаленскай вобласці, гімназіі № 5 г. Віцебска і інш. Кіраўнікі школьных музеяў падзяліліся вопытам пошукавай работы. Юныя патрыёты наведалі Лёзненскі раённы ваенна-гістарычны музей, мемарыял «Тихмяновская высота», музей баявой славы Бабінавіцкай школы і інш.

9 мая ў Чашніцкім гістарычным музеі адкрылася выстава «Солдатские письма» з сямейных архіваў жыхароў раёна. На свяце ў

сёння». Удзельнікі пазнаёміліся са зместам гісторыка-краязнаўчага праекта «Сенненскі край у вянку Беларусі», прысвечанага 750-гадоваму юбілею горада Сянно, даведаліся пра дзейнасць краязнаўчага клуба «Спадчына» пры ЦРБ і рэалізацыю мэтавай праграмы «Зямлі маёй мінулы лёс» у Багушэўскай гарпасялковай бібліятэцы. У праграму семінара была ўключана літаратурна-краязнаўчая гасцёўня «Сенненщина – ты моя песня и легенда».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У маі бібліятэкары райцэнтра арганізавалі сустрэчу з пісьменнікам Уладзімірам Ягоўдзікам. На мерапрыемства «Родная мова, гучы!» былі запрошаны вучні 3-х класаў. Дзеці слухалі вершы, загадкі, апавяданні пра братоў нашых меншых у выкананні аўтара, самі чыталі вершы на беларускай мове, пазнаёміліся з выставай «…Два крылы Уладзіміра Ягоўдзіка».

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У чэрвені раённая дзіцячая бібліятэка запрасіла ўсіх жадаючых на агульнагарадскую бібліяраніцу «Вось яно якое, кніжнае лета».Удзельнікаў мерапрыемства чакала прадстаўленне лялечнага тэатра «Батлейка», квэст-гульня «У гасцях у казкі» і інш.

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

31 мая на базе бібліятэк Станіславоўскага і Радзюкоўскага сельскіх Саветаў адбыўся выязны семінар бібліятэчных работнікаў раёна на тэму «Сельская бібліятэка – тэрыторыя для чытання і вольнага часу». Бібліятэкар Пялікаўскай бібліятэкі Наталля Другакова падзялілася вопытам сваёй работы па краязнаўстве. Работнік Васюкоўскай бібліятэкі Алена Пагарэлава пазнаёміла калег з дзейнасцю аматарскага аб'яднання для дзяцей «Натхненне». Удзельнікам семінара ў Радзюкоўскай бібліятэцы была прадстаўлена візітка бібліятэкі. У сельскім Доме

раёнаў, г. Наваполацка, а таксама шэрагу краёў Латвіі і раённых самакіраванняў Літвы. У якасці ганаровых гасцей прысутнічалі консул Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя і консул Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у г. Даўгаўпілсе Уладзімір Клімаў. На сустрэчы ў райвыканкаме адбыўся адкрыты дыялог, абмен вопытам, быў падпісаны шэраг дагавораў, распрацавана павестка дня наступнага пасяджэння. У кінаканцэртнай зале «Іскра» ўдзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з вырабамі майстроў народнай творчасці, паглядзелі вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці раёна. (*Родныя вытокі. – 2017. – 21 чэрв. – С. 1–2.)*

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

14 мая да Міжнароднага дня сям'і ў Гарадоцкім культурна-асветніцкім цэнтры было праведзена свята «Семья, как и Родина, должна быть у каждого!». Арганізатары – КАЦ, сетка публічных бібліятэк, кінасетка, Гарадоцкае дабрачынне, ЗАГС, раённае аб'яднанне прафсаюзаў.

18 мая ў Глыбокім было праведзена раённае мерапрыемства «Тата, твой выхад!», арганізаванае аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама і РГА «Белая Русь». На раённую сцэну выйшлі прадстаўнікі моцнай паловы са сваімі дзецьмі. На цэнтральнай плошчы горада працавалі тэматычныя пляцоўкі. (*Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 21 чэрв. – С. 5.)*

19 мая адбылося свята вёскі Малыя Давыдкі Глыбоцкага раёна. Святы вёсак – важныя сацыякультурныя мерапрыемствы, якія сталі традыцыйнымі на глыбоцкай зямлі. Работнікі Падсвільскага Дома культуры арганізавалі свята з музыкай, песнямі, тэатралізаванымі пастаноўкамі, уручэннем падарункаў. **10 чэрвеня** прайшло свята вёскі Бобрыкі. Канцэртную праграму для яе жыхароў падрыхтавалі

супрацоўнікі і творчыя калектывы Ломашаўскага СДК. На гэтых святах прысутнічалі прадстаўнікі райвыканкама на чале са старшынёй Алегам Морхатам.

Жыхары вёскі Азіна Полацкага раёна **ў маі** сталі сведкамі святочнага дзейства, галоўным героем якога быў бусел – крылаты сімвал нашай краіны. Напярэдадні свята вёскі быў аб'яўлены конкурс «Бусел на хаце – шчасце ў хаце». Работнікі Азінскага СДК падрыхтавалі праграму «Бусліны клёкат – гэта родны дом». Святочную атмасферу стварылі выступленні ансамбля Азінскага СДК «Бела чайка» і артыстаў Мацюшэўскага СДК. Працавала выстава творчых работ вяскоўцаў. Былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу на лепшыя малыя архітэктурныя формы «Бусел». (*Полацкі веснік. – 2017. – 2 чэрв. – С. 5.*)

Цікава прайшло свята вёскі Старая Беліца Сенненскага раёна, арганізаванае работнікамі Палымянскага сельскага клуба сумесна з мясцовай бібліятэкай. У праграме: выступленне вакальнай групы «Палымяначка», выставы творчасці мясцовых майстрых, кніжная выстава «Вольны час – карысна і цікава» і інш.

26 мая ў Чарэйскім СДК Чашніцкага раёна праведзена літаратурна-краязнаўчая гадзіна, прысвечаная 140-годдзю знакамітага французскага паэта Оскара Мілаша, які нарадзіўся ў Чарэі. На свята прыехалі ўдзельнікі праекта «Літаратурнае падарожжа», арганізаванага Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. (*Чырвоны прамень. – 2017. – 13 чэрв. – С. 4, 7.*)

«Куточак, сэрцу дарагі» – пад такой назвай **17 чэрвеня** культработнікі і ўдзельнікі народнага ансамбля народнай песні і музыкі «Вераснянка» Мазалаўскага СДК Віцебскага раёна правялі свята вёскі Сакольнікі і канцэрт у вёсцы Хайсы.

У чэрвені на Ушаччыне славілі сваіх знакамітых ураджэнцаў Васіля Быкава і Петруся Броўку. 19 чэрвеня ў вёсцы Бычкі прайшла літаратурна-музычная імпрэза «Народжаны сумленнем» (да 93-х угодкаў В. Быкава). 24 чэрвеня ў райцэнтры адбылося раённае свята паэзіі «Пахне

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 мая літаратурны салон «Пад небасхілам кахання» пры Варапаеўскай гарпасялковай бібліятэцы сабраў аматараў паэзіі і быў прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Раісы Баравіковай.

26 мая ў Пастаўскай ЦРБ адбылося святочнае пасяджэнне клуба па інтарэсах «Сучаснікі» – літаратурна-музычны вечар «О, как застенчива сирень в дождливом и холодном мае!».

9 чэрвеня супрацоўнікі Пастаўскай ЦРБ правялі літаратурнае свята «Душой народжанае слова» ў рамках Міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». На ім прысутнічалі паэт Алесь Жыгуноў і кампазітар Браніслаў Грамакоўскі з Глыбокага, фальклорны ансамбль Елгаўскага беларускага таварыства «Лянок» (Латвія), члены грамадска-асветніцкай суполкі «Уздым» на чале з Людмілай Сіняковай (г. Даўгаўпілс), пастаўскія паэты Ігар Пракаповіч, Вольга Лісіцкая і інш.

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 чэрвеня да Міжнароднага дня абароны дзяцей у бібліятэцы-філіяле № 8 у рамках прававой праграмы «Юрыдычная азбука» было праведзена свята «Дзецям свету – шчаслівае дзяцінства», у бібліятэцы-філіяле № 5 прайшло свята «Калі смяюцца дзеці».

21 чэрвеня для чытачоў бібліятэкі імя Л. Талстога была праведзена гадзіна мужнасці «Зачем ты, война, у мальчишек их детство украла?».

22 чэрвеня ў дзіцячым аддзеле бібліятэкі імя Янкі Купалы ў рамках індывідуальнай творчай праграмы «Абарані правы дзіцяці» была арганізавана гадзіна пазнанняў і адкрыццяў «Пра Беларусь і беларусаў», прысвечаная Дню Незалежнасці.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

17 мая ў ЦРБ прайшоў семінар-практыкум для бібліятэчных работнікаў «Адкрываем Радзіму – пазнаём сябе. Бібліятэчнае краязнаўства

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

9 мая супрацоўнікі ЦРБ арганізавалі работу тэматычнай пляцоўкі «И снова май, цветы, салют».

13 мая ў Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы быў праведзены пазнавальны калейдаскоп «Выбираешь профессию – выбираешь судьбу».

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

12 мая ў дзіцячай бібліятэцы праведзена мультымедыйнае свята «Светлая пара» (да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

21 чэрвеня ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся вечар паэзіі з заслужаным дзеячам культуры РСФСР і заслужаным паэтам Масковіі «Свет натхнення Валерыя Ціханава».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2–31 мая ў цэнтральнай раённай бібліятэцы праводзіўся месячнік літаратуры пад назвай «У кніжную прастору ўсёй сям'ёй».

9 мая бібліятэкары ўдзельнічалі ў акцыі «Бессмяротны полк» і агітцягніку мужнасці «Священную память храня о войне…» у гарадскім парку г. Лепеля.

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Напярэдадні свята **9 мая** ў літаратурнай кавярні «Пад абажурам» з навучэнцамі ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. п. Лёзна» прайшла сустрэча пакаленняў «Во имя памяти ушедших, во имя совести живых».

Да Дня сям'і ў раённай бібліятэцы было арганізавана сямейнае свята «Дела семейные. Дела сердечные», на якім прысутнічалі шлюбныя пары з розным сямейным стажам.

3 чэрвеня аддзел па рабоце з дзецьмі і народны клуб «Флора» на Свяце дзяцінства правялі гульнёвую праграму, прысвечаную вядомаму земляку-фалькларысту М. Нікіфароўскаму і яго даследаванню пра нячысцікаў.

чабор», прысвечанае 112-й гадавіне з дня нараджэння П. Броўкі.

24 чэрвеня аграгарадок Баброва Дубровенскага раёна ўрачыста адзначыў сваё 235-годдзе. Арганізатары і спонсары ўручылі жыхарам памятныя сувеніры ў розных намінацыях. На свята прыехаў ураджэнец Баброва Мінай Карніенка, на сродкі якога быў устаноўлены памятны знак землякам, якія загінулі ад выбухованебяспечных прадметаў. На гэты раз ён уручыў музею ільну, створанаму ў мясцовай бібліятэцы, два пано пачатку XX стагоддзя. Самадзейныя артысты выступілі з канцэртным нумарамі.

26 чэрвеня ў Арт-цэнтры Марка Шагала адбыўся вечар аўтарскай песні і паэзіі «На Пушкинском мосту тебя я жду…», прысвечаны памяці віцебскага паэта і грамадскага дзеяча Давіда Сімановіча.

КЛУБНАЯ СПРАВА

4 мая народны драматычны тэатр «Время» Цэнтра культуры Наваполацка правёў форум-спектакль «М^2», дзе кожны глядач мог паспрабаваць сябе ў ролі артыста, умяшацца ў сцэнарый і змяніць сітуацыю ў лепшы бок. Рэжысёр Ірына Цярэнцьева.

Напярэдадні **9 мая** і ў Дзень Перамогі не засталіся без увагі пажылыя людзі аддаленых вёсак Браслаўскага раёна. З канцэртам «Песні ваенных гадоў» іх наведалі артысты раённага аўтаклуба.

Па Шумілінскім раёне калясіла франтавая канцэртная перасоўка – стылізаваны грузавік з артыстамі аўтаклуба. Гучалі вядомыя песні, гармонік, людзі з задавальненнем слухалі знаёмыя мелодыі і падпявалі.

11 мая ў Пастаўскім Доме рамёстваў «Стары млын» адкрылася выстава, прысвечаная традыцыйнаму віду наіўнага народнага мастацтва – маляванцы. Аўтары – Вольга Гукава і Яніна Лімаиоўская.

Тэатр песні «Субботея» Цэнтра культуры Наваполацка **ў маі** ажыццявіў пастаноўку музычнага спектакля «Кошкин дом». Рэжысёр – кіраўнік калектыву Кацярына Фядотава. Большасць сцэнічных касцюмаў зрабіла спецыяліст Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры Галіна

Акуцёнак.

12 мая ў Міёрскім раённым Доме культуры адбыўся канцэрт «Дзеці міру – дзецям вайны». Выхаванцы і настаўнікі СШ № 3 імя Героя Савецкага Саюза Ягора Томкі падарылі свой канцэрт людзям, якія страцілі бестурботнае дзяцінства, перажылі горыч нястач, галечу і голад.

15 мая ў Верхнядзвінскім Цэнтры культуры і народнай творчасці адкрылася выстава «Времен связующая нить». Аўтар – майстар па вышыўцы гладдзю, член народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Муза Булаўская.

Работнікі Дзеркаўшчынскага Цэнтра культуры Глыбоцкага раёна аб'ядналі майскія святы – Дзень працы і Дзень сям'і – і арганізавалі святочную шоу-праграму «Мой калектыў – мая сям'я» з удзелам каманд працоўных калектываў.

У Докшыцкім раённым Доме рамёстваў **у маі** адкрылася выстава работ майстра бісерапляцення народнага клуба «Докша» Людмілы Юковіч. Экспазіцыю дапоўнілі вышываныя карціны яе маці – Дануты Далжук.

«Сямейны вернісаж» – пад такой назвай правялі конкурсную праграму работнікі Міёрскага ДК. Арганізатары – клуб маладой сям'і «Мядовы месяц» і мясцовы ЗАГС.

У Чашніцкім Доме рамёстваў экспанавалася выстава ікон «Таямніцы душы». Аўтар – народны майстар Мікалай Рыбачонак з г. Новалукомля, удзельнік клуба «Майстар» раённага Дома рамёстваў.

З мэтай папулярызацыі народных мастацкіх промыслаў Полацкі раённы цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур пачаў рэалізацыю новага творчага праекта пад адкрытым небам. Ля памятнага знака літары «Ў» народныя майстры арганізуюць выставы-продаж сваіх работ і праводзяць майстар-класы для ўсіх жадаючых.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца «Прэм'ер-Спонайд» КСК ААТ «Полацк-Шкловалакно» быў удастоены Гран-пры Міжнароднага фестывалю-конкурсу «Каспийский бриз», які

І. Я. Храпавіцкага. На мерапрыемстве прысутнічалі навуковыя супрацоўнікі з Мінска, Віцебска, Полацка, бібліятэчныя і музейныя работнікі раёна, мясцовыя жыхары. Завочна ў канферэнцыі ўдзельнічалі навуковыя супрацоўнікі з Расіі, Польшчы, Казахстана, Украіны, Узбекістана.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

31 мая адбыўся раённы семінар на тэму «Сельская бібліятэка як фактар фарміравання сучаснай сацыякультурнай прасторы сяла» на базе Бабініцкай сельскай бібліятэкі – цэнтра экалагічнага выхавання.

23 чэрвеня цэнтральная раённая бібліятэка ў рамках культурна-асветніцкага праекта «І вечным застанецца слова…» на адкрытай летняй пляцоўцы правяла вечар-дыялог «Я песняй і словам услаўляю родны край», прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, з удзелам выкладчыкаў і вучняў Мазалаўскай ДШМ. Дзейнічала выстава-панарама «Кніжная культура Беларусі», прайшоў конкурс знаўцаў «З гісторыі кнігадрукавання», гучалі гармонік і цымбалы, беларускія песні. У чытальнай зале маленькіх чытачоў чакаў лялечны міні-спектакль-казка «З даўніны далёкай».

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

9 мая ў рамках святкавання Дня Перамогі ў райцэнтры работнікі ЦРБ падрыхтавалі экспазіцыю «Франтавая бібліятэка».

9 чэрвеня быў праведзены выязны семінар бібліятэчных работнікаў раёна на тэму «Культурна-асветніцкая дзейнасць публічнай бібліятэкі: ідэі, практыка, праекты». У ЦБР адбыўся абмен вопытам работы, затым семінар прадоўжыўся на базе Вайханскай бібліятэкі-клуба, дзе быў праведзены Дзень сямейнага чытання і адпачынку «Секреты семейного счастья».

А. Пузікава «Спасибо за жизнь!», ініцыятарам якой стаў каардынацыйны цэнтр абароны жыцця і сямейных каштоўнасцяў «Зарождение» Полацкай епархіі (бібліятэка імя Я. Коласа); выстава творчых работ удзельнікаў студыі выяўленчага мастацтва «Хамелеон» Палаца дзяцей і моладзі «Кототерапия» (бібліятэка імя У. Караткевіча); персанальная выстава паэта, мастака У. Ладзіка «Жизни льющийся поток» (ЦБ імя У. Маякоўскага); выстава работ навучэнцаў ДМШ імя І. Хруцкага «Мой город – мое вдохновение» (дзіцячая бібліятэка імя А. С. Пушкіна).

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

18 мая ў цэнтральнай бібліятэцы адбыўся семінар бібліятэчных работнікаў раёна на тэму «Роля і месца бібліятэкі ў сучасным інфармацыйна-камунікатыўным асяроддзі рэгіёна».

20 чэрвеня ў дзіцячай бібліятэцы адбылася сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі К. Хадасевіч-Лісавай. Візіт сучаснай пісьменніцы-казачніцы на Браслаўшчыну адбыўся па запрашэнні бібліятэкараў у рамках рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кнігай».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

23 мая супрацоўнікі аддзела абслугоўвання ЦРБ сумесна з клубам цікавых сустрэч «Сучаснік» правялі літаратурную імпрэзу «Я сын твой, прыдзвінскі мой край дарагі», прысвечаную 75-гадоваму юбілею беларускага пісьменніка Сяргея Панізніка.

23 мая ў ЦРБ імя Т. Хадкевіча прайшла сацыяльна-культурная акцыя «Библионочь». Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі таксама далучыліся да акцыі і правялі “Библиосумерки”, насычаныя праграмай для дзяцей і падлеткаў.

16 чэрвеня ў аграгарадку Каханавічы адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя “Праблемы гісторыі і культуры пагранічча: гуманітарныя веды і выклікі часу”, прысвечаная 200-годдзю

праходзіў **у маі** ў горадзе Баку – сталіцы Азербайджана.

У Вялікім Ноўгарадзе (Расія) **у маі** прайшоў Ганзейскі тыдзень. У культурнай праграме тыдня сваю творчасць прадставіў народны тэатр гістарычнага касцюма «Полацкі звяз» Полацкага гарадскога Палаца культуры, які з поспехам ажыццявіў пастаноўку спектакля «Гражына» паводле аповесці Адама Міцкевіча.

Работнікі Мікалаёўскага сельскага клуба Міёрскага раёна Ігар Мятла і Марыя Арцімёнак прынялі ўдзел у Днях беларускай культуры ў г. Даўгаўпілсе (Латвія). Мерапрыемства праходзіла ў Цэнтры беларускай культуры, куды з’ехаліся прадстаўнікі беларускіх дыяспар з Польшчы, Расіі, Украіны, Латвіі і іншых краін.

У маі на базе Пальмінскага СДК Гарадоцкага раёна быў праведзены чарговы навучальны семінар для работнікаў клубных устаноў раёна. Ён быў прысвечаны фарміраванню здаровага ладу жыцця, прафілактыцы злачынстваў сярод падлеткаў, выкарыстанню сучасных форм вольнага часу для развіцця творчых здольнасцяў у дзяцей.

Ва Ушацкім раённым Цэнтры культуры **ў маі** адбылося святкаванне 30-гадовага юбілею народнага фальклорнага калектыву «Матырынская спадчына» Матырынскага СДК. Віншавальныя нумары юбілярам падрыхтавалі ўдзельнікі хору народнага клуба «Ветэран» і вакальны гурт «Дубравушка».

На сцэне Глыбоцкага ГДК **у маі** прайшоў першы раённы конкурс «Два галасы», у якім удзельнічалі 13 сямейных дуэтаў.

9 чэрвеня ў Пастаўскім Доме рамёстваў «Стары млын» адкрылася выстава жывапісу таленавітай зямлячкі, а цяпер жыхаркі г. Рэутаў Маскоўскай вобласці Людмілы Курыловіч пад назвай «Прыцяжэнне. Памяць сэрца».

Раённы фальклорны семінар «Ахова культурнай спадчыны і захаванне мясцовага каларыту» адбыўся ў аграгарадку Дрысвяты Браслаўскага раёна **ў чэрвені**. У семінары бралі ўдзел кіраўнікі і работнікі ўстаноў культуры Браслаўшчыны, навуковы супрацоўнік НАН Беларусі

Н. Бункевіч, прадстаўнікі ВАМЦНТ.

У Глыбоцкім Доме рамёстваў **у чэрвені** экспанавалася выстава выцінанкі «Па сцежках народнага календара». Аўтар – полацкі майстар Алена Шушарт.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

6–7 мая ў Глыбоцкім раёне адбыўся першы фестываль дударскіх рэгіёнаў «Дударскі рэй», удзел у якім прынялі вядомыя музыканты з Беларусі, Карэліі, Польшчы, Шатландыі, Бельгіі, Чэхіі. Да фэсту падрыхтавалі дзве адметныя выставы – «Дуда ты мая спеўная» (Глыбоцкая цэнтральная раённая бібліятэка) і «Велікапольскія дуды ў XXI стагоддзі» (Глыбоцкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей). Адкрыццё музычнага свята адбылося ў скверы Знакамітых Землякоў райцэнтра, урачыста прайшло шэсце з удзелам дудароў і гасцей фестывалю – дэлегацый з Латвіі і Літвы. На свяце прысутнічаў намеснік старшыні місіі пасольства Вялікабрытаніі ў Мінску Ян Фокс. На працягу двух дзён музыканты далі імправізаваныя канцэрты не толькі ў Глыбокім, але і ў аграгарадках Празарокі, Пліса, Удзела і вёсцы Мосар. Фінальным акордам фэсту стала творчая сустрэча дудароў з вучнямі і настаўнікамі Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў. (*Витебские вести. – 2017. – 11 мая. – С. 14. ; Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 13 мая. – С. 1, 4.*)

72-й гадавіне Вялікай Перамогі быў прысвечаны агляд-конкурс патрыятычнай песні «Пераможныя маршы» ў Наваполацку. У Чашніцкім раёне напярэдадні Дня Перамогі ў Саснягоўскай пушчы ў другі раз прайшоў міжраённы ваенна-патрыятычны конкурс «Песня – часціна душы».

17 мая ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся абласны семінар для спецыялістаў па фальклоры, прысвечаны падрыхтоўцы да абласнога агляду-конкурсу вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца-2017». Для слухачоў семінара прайшла прэзентацыя фільма «Вялікая вясельніца. Рэканструкцыя

18 мая ў ЦГБ імя М. Горкага была праведзена літаратурная вечарына «И ему благодарен город», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння вядомага віцебскага паэта і празаіка Давіда Сімановіча. Увазе прысутных была прадстаўлена мультымедыйная прэзентацыя, якая пазнаёміла з жыццёвымі і творчымі старонкамі жыцця паэта. Сваімі асабістымі ўспамінамі падзялілася народная артыстка Беларусі Святлана Акружная, якую звязвала з паэтам шматгадовае сяброўства, у яе выкананні прагучалі вершы паэта.

9 чэрвеня была арганізавана лекцыя «Нобелевские лауреаты по литературе из США» ў бібліятэцы імя М. Горкага. Лекцыю прачытаў прафесар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Ю. В. Стулаў. Лекцыю суправаджаў відэарад, які прадставіў усіх лаўрэатаў, а таксама асобныя фрагменты з кінафільмаў і мюзікла «Кошкі». Другая частка лекцыі пазнаёміла з лаўрэатамі Пулітцараўскай прэміі. Адбылася прэзентацыя выставы «Амерыканская літаратура XXI стагоддзя» і кніжнай калекцыі нобелеўскіх лаўрэатаў па літаратуры, якія прадставіў інфармацыйны цэнтр пры пасольстве ЗША ў Беларусі.

У межах рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кнігай» **20 чэрвеня** бібліятэка імя У. Караткевіча сумесна з УП «Віцебскаблсаюздрук» арганізавала літаратурнае свята «Трэба кожны дзень чытаць, каб разумным, добрым стаць».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

3 мая ў сектары мастацтваў ЦБ імя У. Маякоўскага адбыўся вечар памяці «Пока их помним, будет мир!», ініцыятарамі правядзення якога сталі літаратары з літаратурнага аб’яднання «Крыніцы». Некаторыя з іх – дзеці вайны, выказалі свае дзіцячыя ўспаміны жывой мовай паэзіі. Д. І. Пугачэўская прачытала ўрыўкі са сваёй паэмы «Детства раненого память», Р. А. Гергерт ўзгадала ваеннае дзяцінства. А пасляваенныя літаратары перадалі ўспаміны сваіх родных і ў вершах, і ў прозе.

У бібліятэках на працягу **чэрвеня** экспанаваліся: фотавыстава

1 чэрвеня супрацоўнікі нямецкай чытальнай залы прынялі ўдзел у адкрыцці летняй змены школьнага лінгвістычнага лагера СШ № 34. Для школьнікаў, якія вывучаюць нямецкую мову, быў падрыхтаваны паказ кінакнігі Соні Бугаевай «Wie Frau B. so böse wurde».

5 чэрвеня ў бібліятэцы адбылася вечарына памяці «Гарыць зорка лёсу»: да 80-годдзя з дня нараджэння паэта, празаіка, Ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Барыса Беляжэнкі. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталля Шыянок падкрэсліла вялікі ўнёсак Барыса Беляжэнкі ў культурную спадчыну Віцебшчыны. На вечарыне выступілі віцебскія літаратары Т. Краснова-Гусачэнка, М. Намеснікаў, У. Крайнеў, акцёр-коласавец Ю. Цвірка, хормайстар В. Рауза і многія іншыя. Гучалі вершы і песні на словы Барыса Беляжэнкі.

У рамках бібліятэчнага праекта «Літаратурныя ўрокі для школьнікаў: новы фармат» супрацоўнікі бібліятэкі праводзілі літаратурныя ўрокі па творчасці рускіх і замежных пісьменнікаў для дзяцей з летніх школьных лагераў. Толькі за **чэрвень** бібліятэчныя літаратурныя ўрокі наведалі каля 500 віцебскіх школьнікаў і гімназістаў.

ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

27 чэрвеня ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна прайшло пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Орша ў сэрцы кожнага з нас» з удзелам аршанскіх паэтаў.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

Акцыя памяці «Дзень белых жураўлёў» у чарговы раз адбылася на Плошчы Перамогі. **5 мая** ля Вечнага агню сабраліся бібліятэкары і чытачы бібліятэк імя М. Горкага, імя Е. Лось, імя Я. Маўра і імя П. Броўкі. Прагучалі словы падзякі тым, хто прынёс Перамогу, прагучаў «Рэквіем» Р. Раждественскага, а потым у неба ўзляцелі паветраныя шары з белымі жураўлямі, як памяць пра тых, хто загінуў на вайне.

вясельных звычаяў Гарадоцкага, Дубровенскага і Лёзненскага раёнаў». У семінары прынялі ўдзел вядомыя навукоўцы: кандыдат філалагічных навук, дацэнт, даследчык духоўнай культуры беларускага народа Іван Крук і старшы выкладчык кафедры «Рэжысура абрадаў і святаў» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аксана Катовіч. Тэмы іх выступленняў: «Традыцыйная культура Беларусі», «Кола святаў беларускага народнага календара», «Сямейная абраднасць».

20–21 мая прайшоў XXIV Міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне». Ён сабраў звыш 800 знаўцаў і прыхільнікаў музычнага фальклору з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Літвы, Латвіі і Польшчы. Упершыню на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы быў праведзены абласны конкурс аркестраў народных інструментаў, аркестраў баянаў і акардэонаў, цымбальных аркестраў «Спяваем з аркестрам», у якім прынялі ўдзел 12 калектываў Віцебшчыны – звыш 350 чалавек. Журы ўзначаліў заслужаны дзеяч культуры Беларусі Мікалай Пашынскі. У свяце-конкурсе традыцыйнай свістулькі «Салавейка-2017» удзельнічалі 15 майстроў з Беларусі і Расіі, якія адраджаюць забытыя тэхнікі ганчарных школ. Гран-пры дастаўся майстру Уладзіміру Квашко з Сянно. У рамках фестывалю былі праведзены свята рамёстваў «Дняпроўскі кірмаш», гала-канцэрт «Чаруеш і яднаеш ты, Дняпро!», народны абрад праводзінаў гасцей «Пасахі – на лёгкія шляхі» ад фальклорнага калектыву «Кудзеліца» і інш. (*Витебские вести. – 2017. – 23 мая. – С. 4. ; Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2017. – 24 мая. – С. 5.*)

26 мая на сцэне Віцебскай абласной філармоніі прайшоў абласны агляд-конкурс «Лепшая мнагадзетная сям'я Віцебшчыны-2017». Журы на чале з дырэктарам філармоніі Аленай Падаляк прысудзіла першае месца сям'і Краўчукоў з Віцебска.

27 мая ў Гарадку ў дзявяты раз прайшло раённае свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас», прысвечанае аўтару паэмы «Тарас на Парнасе» Канстанціну Вераніцыну. Праграма ўключала «Свята панадворкаў», «Кірмаш ля Парнаса», адкрыты конкурс

дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса?», акцыю «Чытаем паэму разам», заключны тур раённага чэмпіянату па інтэлектуальных гульнях сярод школьнікаў «Гульні розуму», велапрабег «Сцежкамі Тараса», конкурс творчых праграм устаноў культуры вобласці, канцэрт «Вечарынка на Парнасе». На свяце паэзіі «Вераніцынская зорка» гучалі творы патрыятычнай і гістарычнай тэматыкі ў выкананні паэтаў і празаікаў Вялікалуцкага прадстаўніцтва Пскоўскага рэгіянальнага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі і членаў народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» з Полацка. (*Витебские вести. – 2017. – 30 мая. – С. 3.* ; *Гарадоцкі веснік. – 2017. – 30 мая. – С. 1–2.*)

27–28 мая адбыўся Міжнародны фестываль традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы». На святкаванне паўвекавога юбілею творчага форуму з'ехаліся афіцыйныя дэлегацыі і творчыя калектывы з сямі краін: Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Арменіі. Непасрэдны старт святочным мерапрыемствам дало адкрыццё памятнага знака «Браслаўскіх зарніц». У рамках свята адбылося ўрачыстае адкрыццё паруснай школы з удзелам старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая Шарснёва і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Конрада Паўліка. Самым каларытным мерапрыемствам фестывалю стаў абласны агляд-конкурс вакальна-харавых калектываў «Браслаўская харавая асамблея», праведзены ў шосты раз. Сёлетняя асамблея сабрала 22 дарослыя калектывы і 6 дзіцячых хароў не толькі з Віцебшчыны, але і з Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. На Замкавай гары браслаўчан і гасцей фестывалю вітала свята сярэднявечнай культуры «Меч Брачыслава». У гала-канцэрце прыняў удзел Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча. (*Витебские вести. – 2017. – 30 мая. – С. 1, 4. ; Браслаўская звязда. – 2017. – 31 мая. – С. 4–5.*)

28 мая ў Верхнядзвінску ў 17-ы раз праведзена рэгіянальнае дзіцячае свята мастацтваў «Двина – Дзвіна – Daugava», якое сабрала звыш 500 юных талентаў з 12 гарадоў Беларусі, Расіі і Латвіі. Дзіцячыя творчыя

11 мая адбылася літаратурна-музычная вечарына «Кто знает – вечность или миг...» да 80-годдзя з дня нараджэння Бэлы Ахмадулінай.

11 мая былі праведзены чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Як ствараўся ўніверсітэт у Віцебску».

16 мая ў рамках цыкла мерапрыемстваў, прысвечаных 85-годдзю з дня нараджэння Давіда Сімановіча, у бібліятэцы адбыўся круглы стол «Здесь осталась его душа...». На працягу ўсяго дня сябры, калегі, родныя, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі горада, прыхільнікі паэзіі, усе тыя, хто захоўвае памяць пра Давіда Рыгоравіча Сімановіча, гаварылі пра Паэта, Грамадзяніна, Асобу.

17 мая быў арганізаваны Дзень прававой культуры «Сям'я ў сучасным грамадстве».

18 мая адбылася прэзентацыя трэцяга выпуску літаратурна-мастацкага альманаха «Ратуша», выдадзенага Віцебскім абласным аддзяленнем Саюза беларускіх пісьменнікаў. Папярэднія выпускі пабачылі свет у 2014 і 2016 гадах.

22 мая ў бібліятэцы прайшоў нацыянальны мікс «Чайный церемониал – искусство и ритуал», прымеркаваны да Міжнароднага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця.

25 мая прайшла прэзентацыя новай работы віцебскага мастака Ігара Дурава з трыпціха пра замкі Віцебска (XII, XIV, XVII стст.).

29 мая ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылася сустрэча з актрысай, вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Анжалікай Баркоўскай «Круг». На сустрэчу з актрысай прайшлі яе сябры, акцёры, прыхільнікі таленту. У выкананні Анжалікі Купрыянаўны гучалі ўрыўкі з малдаўскіх песень, балад, вершы любімых паэтаў.

30 мая ў бібліятэцы ў рамках рэгіянальных кансультацый Кастрычніцкага эканамічнага форуму KEF-2017 адбылася канферэнцыя «Возвращение к росту: поиск решений для регионального развития».

вобласці. 7 чэрвеня ў рамках рэспубліканскай акцыі «Кніга – крыніца мудрасці, ведаў і навукі ...» кіраўнікі і спецыялісты Нацыянальнай бібліятэкі, Віцебскай абласной бібліятэкі і Міністэрства культуры наведалі бібліятэкі Віцебскага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў, а таксама дзіцячага дома г. Віцебска. У дар ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўстановы атрымалі камплекты літаратуры – 200 асобнікаў розных выданняў. Затым удзельнікі семінара працягнулі працу ў Мазалаўскай сельскай бібліятэцы, дзе пазнаёміліся з дзейнасцю бібліобуса Віцебскага раёна, а таксама цэнтра дадатковай адукацыі, які функцыянуе ў рамках праекта «Пашырэнне эканамічных магчымасцяў у сельскай Беларусі» пры падтрымцы фонду «Новая Еўразія». У завяршэнне паездкі госці наведалі народны музей «Гісторыя Заронаўскага краю».

21–22 чэрвеня ў Міёрах адбыўся абласны семінар на тэму «Мадэляванне бібліятэчнага абслугоўвання ў дзіцячых бібліятэках: дыяпазон метадаў, ідэй і практыкі» для загадчыкаў дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці. У ходзе работы семінара ўдзельнікі пазнаёміліся з асноўнымі напрамкамі дзейнасці дзіцячых бібліятэк Міёрскага, Лёзненскага, Пастаўскага, Браслаўскага, Глыбоцкага, Докшыцкага раёнаў і г. Наваполацка. Удзельнікі семінара наведалі бібліятэкі Міёрскай ЦБС, экалагічны цэнтр «Ельня» і музей кнігі і друку СШ № 3 г. Міёры, дзе была арганізавана сустрэча з гісторыкам і краязнаўцам В. Ермалёнкам.

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

2 мая ў нямецкай чытальнай зале былі падведзены вынікі міні-конкурсу на лепшую велікодную кампазіцыю, які праводзіўся сярод навучэнцаў школ-партнёраў Віцебскай абласной бібліятэкі, якія вывучаюць нямецкую мову.

10 мая ў бібліятэцы адбылася літаратурная вечарына «Дзень Перамогі – галоўнае свята», арганізаваная сумесна з Віцебскім абласным аддзяленнем ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

калектывы паказалі высокі ўзровень майстэрства і багаты рэпертуар. Дзіцячае свята было насычана забаўляльнымі мерапрыемствамі, выставамі, конкурсамі, паказальнымі выступленнямі, танцавальнай праграмай. (*Витебские вести. – 2017. – 30 мая. – С. 8. ; Дзвінская праўда. – 2017. – 2 чэрв. – С. 4.*)

У маі ў Санкт-Пецярбургу прайшоў Х Міжнародны творчы фестываль дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі «Шаг навстречу», у якім прыняла ўдзел Маша Кірык з Дуброўна. Яна стала лаўрэатам I ступені ў двух намінацыях: «Вакал», тут яна прадстаўляла народную студыю эстрадных спеваў «Крэатыў» ГДК «Орша», і «Харэаграфія», якой яна займаецца на базе Дубровенскага цэнтра дзяцей і моладзі.

1–3 чэрвеня ў Віцебску праходзіў фестываль творчасці выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў для дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю пад назвай «Мары здзяйсняюцца». Ён быў арганізаваны дабрачынным грамадскім аб’яднаннем «Свет без межаў» пры падтрымцы Віцебскага аблвыканкама і прымеркаваны да Міжнароднага дня абароны дзяцей. На сцэне Летняга амфітэатра прайшоў гала-канцэрт. Гран-пры атрымалі выхаванцы Багушэўскага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

3–5 чэрвеня ў Полацку адбыўся Міжнародны літаратурны фестываль «Цэнтр Еўропы-2017».

4 чэрвеня ў аграгарадку Астроўна Бешанковіцкага раёна праведзена свята духоўнай культуры і творчасці «Траецкі фестываль». У Астровенскім СДК супрацоўнікамі Бешанковіцкага Дома рамёстваў былі арганізаваны выставы і майстар-класы па лозапляценні, пляценні з саломкі і газетных трубачак. Удзельнікі народнага клуба аматараў нацыянальнай кухні, фальклору і гульні «Бараболя» Вярхоўскага СДК частавалі беларускімі стравамі. Адбыўся канцэрт з удзелам творчых калектываў і салістаў з цэнтраў культуры, школ мастацтваў, сярэдніх і нядзельных школ Бешанковіцкага і Лепельскага раёнаў і г. Віцебска. (*Витебские вести. – 2017. – 8 июня. – С. 21.*)

4 чэрвеня ў аграгарадку Таргуны Докшыцкага раёна прайшло свята нацыянальнай культуры «Зберагаем вытокі свае». Галоўная падзея свята – раённы агляд-конкурс «Грай, гармонік». Акрамя таго дзейнічаў «Траецкі кірмаш», на якім свае выставы прадстаўлялі сельскія Дамы культуры і Дом рамёстваў, выступалі мясцовыя самадзейныя артысты.

9–11 чэрвеня Паставы ў 20-раз прымалі ў сябе Міжнародны фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік». Сёлета на музычнае свята завіталі каля 400 самадзейных артыстаў з усіх куткоў Беларусі, а таксама з Расіі, Польшчы, Украіны, Эстоніі, Латвіі і Літвы, прадстаўнікі Цэнтра нямецкай культуры з Бабруйска. У праграме свята: традыцыйны конкурс калектываў і асобных выканаўцаў на народных інструментах «Хто каго?», музычна-тэатралізаванае прадстаўленне «Пастаўскі баль», агляд-конкурс сельскіх падворкаў «Пастаўшчына гасціннная», «Горад майстроў». У канцэпцыю фестывалю арганізатары ўнеслі шмат новага, арганічна спалучыўшы культуру з навукай, ушанаваннем знакамітых землякоў. Адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай акцёрам-землякам Станіславу Ясюковічу і Зыгмунту Кенстовічу, на будынку кінатэатра. У краязнаўчым музеі адкрылася выстава, прысвечаная навукоўцам – ураджэнцам Пастаўшчыны. У рамках фестывалю былі прэзентаваны кніга Тадэвуша Стружэцкага «Беларускія народныя музычныя інструменты» і кніга мясцовага краязнаўцы Ігара Пракаповіча «Залатая выспа: гісторыі і вершы з крыніц народных». (*Витебские вести. – 2017. – 13 июня. – С. 1, 5. ; Пастаўскі край. – 2017. – 14 чэрв. – С. 1, 4.*)

11 чэрвеня ў аграгарадку Заазер'е Полацкага раёна праведзена «Завозерская беразуха-2017» – свята народнага майстэрства, сельскай абраднасці, традыцыйных ведаў і добрасуседства. У праграме: тэатралізаванае прадстаўленне «Легенды Заазер'я», конкурс народнай творчасці і гумару «Дзень суседа», конкурсна-гульнявая праграма «Вясковы фітнес-дром», канцэртная праграма «Народны шансон» з удзелам творчых калектываў і выканаўцаў Полаччыны, «Карнавал вясковых вулачак» і інш.

24 чэрвеня ў г. п. Лёзна адбылося VI абласное свята-конкурс самадзейных паэтаў і кампазітараў «Песні сунічных бароў». Разам з 15 раёнамі Віцебшчыны пазнаёмілі са сваёй паэтычнай і музычнай творчасцю прадстаўнікі Руднянскага, Ельнінскага і Веліжскага раёнаў Смаленскай вобласці. У праграме свята: раённая выстава-конкурс аўтарскай лялькі «Сунічка-2017», выстава-продаж «Феерверк суніц» ад Лёзненскага Дома рамёстваў, гала-канцэрт творчых калектываў Дома культуры аграгарадка Дабрамыслі і інш. Працавалі бібліятэчная пляцоўка «Лёзненшчына літаратурная» і пляцоўка «Паляна гасціннасці», дзе размясціліся падвор'і Лёзненскага раёна і гасцей са Смаленшчыны.

У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола Віцебска «Дзвіна» **ў чэрвені** прайшоў штогадовы абласны агляд-конкурс творчасці інвалідаў па зроку «Спявай, душа!»

У чэрвені ў Германавічах Шаркаўшчынскага раёна адбыўся фестываль бардаўскай песні. Яго арганізатарамі выступілі культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча і Беларуская асацыяцыя журналістаў. У бардаўскім фэсце ўдзельнічалі прадстаўнікі Віцебскай вобласці, Мінска, Гомеля.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

6–7 чэрвеня ў Віцебскай вобласці адбыўся выязны семінар з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры, Віцебскага аблвыканкама, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, навукова-вытворчай фірмы «ІНЕАК» і дырэктараў сетак публічных бібліятэк рэгіёна. 6 чэрвеня на базе Віцебскай абласной бібліятэкі імя. У. І. Леніна ўдзельнікі семінара абмеркавалі пытанні дзяржаўнага рэгулявання бібліятэчнай галіны рэспублікі і перспектывы далейшага развіцця бібліятэк Віцебшчыны. У цэнтры ўвагі апынуліся праблемы інфарматызацыі і развіцця абслугоўвання ў віртуальным асяроддзі, стварэння карпаратыўных рэсурсаў, у тым ліку – рэгіянальных зводных каталогаў (РСЭК). Асаблівая ўвага была ўдзелена ўкараненню аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій у бібліятэках